*Спадчына*

Вольга САКАЛОВА,
кандыдат культуралогіі

# КАШТОЎНАСНЫ ПАДЫХОД ДА СТВАРЭННЯ МЕМАРЫЯЛАЎ

УДК 730.01:17.022.1+725.94

Артыкул прысвечаны ўвасабленню культурных каштоўнасцей у гарадскім ландшафце, выяўленых у візуальнай прасторава-пластычнай форме. Помнікі разглядаюцца ў якасці транслятараў вітальных, сацыяльных, палітычных, рэлігійных і іншых каштоўнасцей з пункту погляду аксіялагічнага падыходу да заканамернасцей формаўтварэння артэфактаў.

Ключавыя словы: *каштоўнасць, каштоўнасны падыход, культурнае ўзаемадзеянне, культ спадчыны, помнік, традыцыя, нацыянальны манумент*.

The article is devoted to the embodiment of cultural values in the urban landscape, expressed in a visual spatial and plastic form. Monuments are seen as translators of vital, social, political, religious and other values in terms of an axiological approach to the patterns of artifact formation.

Ключавыя функцыі помнікаў – мемарыяльная, манументальная, сацыяльная, культурна-асветніцкая, эстэтычная і інш. Сярод іх як адна з найважнейшых вылучаецца аксіялагічная, калі помнік выступае ў якасці транслятара агульначалавечых каштоўнасцей (вітальных, сацыяльных, палітычных, маральных, рэлігійных, эстэтычных), закладзеных у кожнай з этнічных і нацыянальных культур. Гэтыя каштоўнасці могуць запазычвацца. Іх прыманню, засваенню і рэпрадукаванню ў сваім сацыякультурным асяроддзі спрыяе культурнае ўзаемадзеянне.

Тэорыя эвалюцыі каштоўнаснага назапашвання спадчыны стала распрацоўвацца ў пачатку ХХ ст. у працах А. Рыгля, М. Дворжака [1; 2]. Высвятленнем вытокаў культу спадчыны займаецца сучасны даследчык С. Стурэйка, які з пункту погляду сацыяльна-культурнай антрапалогіі ўмоўна вылучае тэорыі паходжання феномена культу спадчыны: эвалюцыйную, дыфузійную, функцыянальную, канструктывісцкую і структурную, разглядаючы іх як вытворныя ад найбуйнейшых антрапалагічных напрамкаў [3].

Эвалюцыя камемаратыўных практык фіксуе канфлікты каштоўнасцей, інтарэсаў, эстэтычных уяўленняў і густаў, тэхнік і методык увасаблення помнікаў.

Такія палітычныя каштоўнасці, як грамадзянскія свабоды, законнасць, канстытуцыя, мір, увасабляюцца ў манументах, закліканых выразіць нацыянальны гонар: Ліпеньская калона ў Парыжы (1835–1840), калона Кангрэсу ў Бруселі (1850–1859), Вітарыяна ў Рыме (1885–1935), помнік Канстытуцыі ў Мадрыдзе (1982) і многія іншыя.

У канцы XVIII ст. распаўсюдзіліся ўнікальныя аб'екты польска-беларускай культурнай спадчыны – мемарыяльныя калоны – помнікі Канстытуцыі Рэчы Паспалітай 3 мая 1791 г. (калоны Славы). Значэнне Канстытуцыі 3 мая як другога ў сусветнай гісторыі кадыфікаванага нацыянальнага акта пасля Канстытуцыі ЗША 1787 г. пацвярджаецца ўнясеннем гэтага дакумента ў Польскі дзяржаўны спіс праграмы ЮНЕСКА "Памяць свету" (2014), у спіс Еўрапейскай спадчыны (2015).

Манументы ў гонар Канстытуцыі ўсталёўваліся па ініцыятыве прагрэсіўна настроенай шляхты і магнатаў (Нямцэвічаў, Радзівілаў, Лапацінскіх, Тызенгаўзаў, Хадкевічаў, Пуслоўскіх, Сапегаў) у іх уладаннях. Такія калоны захаваліся ў Глыбокім, Петрыкаве, Дзятлаве і інш. Формы і ідэі помніка ўзыходзяць да традыцыі ўзвядзення калон у гонар важнай падзеі або ў сувязі з ёю: рымскіх трыумфальных калон, ватыўных (прысвечаных багам) калон Антычнасці і Сярэднявечча. На тэрыторыі сучаснай Беларусі захавалася 12 калон [4], па іншых крыніцах – 18 [5]. Самая велічная 10-метровая калона знаходзіцца побач з вёскай Лявонпаль (на мяжы першага падзелу Рэчы Паспалітай).

Гістарычная фіксацыя некаторых калон змянялася пад уплывам падзей, якія адбываліся на тэрыторыі, дзе былі ўсталяваны манументы. Напрыклад, калоны ў Магілёўцах і Палонску ў розныя часы мясцовае насельніцтва называла калонамі Каліноўскага, а пазней калонамі Траўгута [5, с. 29].

З цягам часу значэнне манументаў забывалася. Натуральнае жыццё помніка змянялася культурнай катастрофай, былое значэнне страчвалася, і ён трапляў у семіятычную паўзу, абумоўленую стратай каштоўнасці ў вачах грамадства. Так, калона ў Фашчоўцы завяршалася драўлянай статуяй святога, цяпер амаль разбуранай, пра якую згадваў У. Караткевіч у рамане "Чорны замак Альшанскі": «У вёсцы Фашчоўцы (Хвашчава) пад Шкловам была калісьці ў сярэднія вякі езуіцкая місія і каля яе стаяла (а можа, і цяпер стаіць) на высокай калоне статуя. Удзячны народ забыўся, хто гэта: святы ці нейкі дзяржаўны дзеяч, але трывала замацаваў у слоўніку словы "ёлуп хвашчоўскі" (дурань хвашчоўскі) для вызначэння чагосьці дурнога і бескарыснага» [6, с. 112]. Такім чынам у жыццёвым цыкле помнік пераходзіў на ўзровень міфапаэтычнага ўспрымання.



Прыдарожныя крыжы.

ся ставіць "крыжы на палях, дарогах і наогул па-за касцёламі", а таксама аднаўляць тыя, якія паваліліся, "каб каталіцкае духавенства не ўчыняла да іх урачыстых працэсій і хросных хадоў з мэтай успамінаў пра палітычныя падзеі і ўзбуджэння патрыятызму" [9, с. 145]. Такія помнікі пасля паўстання 1863–1864 гг. успрымаліся як акты палітычна-рэлігійнай прапаганды, былі звязаны з уяўленнямі пра польскую ідэнтычнасць краю. Імператарскім указам ад 14 сакавіка 1896 г. сельскаму каталіцкаму насельніцтву Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай губерняў крыжы і іншыя святыя выявы па-за могілкамі, храмавымі агароджамі і сядзібамі можна было ставіць толькі з дазволу губернскага кіраўніцтва (што ажыццяўлялася на практыцы рэдка), уводзілася абмежаванне на стварэнне крыжоў з трывалых матэрыялаў.

Шматлікія прыклады знішчэння помнікаў, пакарання ксяндзоў, памешчыкаў і сялян за непадпарадкаванне ў выглядзе грашовых штрафаў падае А. Ганчар на падставе архіўных дакументаў. Так, у 1864 г. у Беластоку за адну ноч былі выкапаны 200 рымска-каталіцкіх жалезных крыжоў, а ў Гродне ўсе крыжы [9, с. 145].

У той жа час усталёўваліся помнікі, якія спрыялі сцвярджэнню праваслаўя. Так, М. Кароль прыводзіць прыклад, калі памешчык Давыдаў у сваім маёнтку Цяраспаль Віцебскага павета паставіў мармуровы помнік з медным кубкам для царкоўных ахвяраванняў, які захоўвае памяць пра перадачу маёнтка «з польскіх рук у рускія і служыць "забытай справе праваслаўя" ў паланізаванай "Белоруссии"» [10, с. 184].

Нягледзячы на ўсе абмежаванні, мясцовыя жыхары без згоды ўладаў аднаўлялі ссечаныя крыжы або рабілі новыя, ставілі іх уздоўж дарог і ў полі. Апісваючы палескую вёску, Якуб Колас адзначаў: "На кожным перакрэстку вуліц стаялі высокія крыжы, павязаныя хвартушкамі з чырвонаю стужкаю" (Палеская вёска. 1906–1907; цыт. паводле: [7]).

У культурнай прасторы Беларусі назіраецца адраджэнне традыцыі ўстаноўкі прыдарожных [11, с. 10] і памятных (пад Оршай, Гомелем [12], у Капылі, Мінску і інш.) крыжоў. Падзеям паўстання 1863–1864 гг. пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага на Клеччыне прысвечаны помнік-крыж, усталяваны каля в. Заастравечча ў 1937 г.

Нярэдка ў беларускіх вёсках каталіцкія і праваслаўныя крыжы стаяць на скрыжаванні побач. Разнастайнасць канфесій, якія мірна суіснуюць, увасабляецца ў памятных знаках. Напрыклад,

Калоны Славы служылі сімваламі веры, іх наверша вянчаў крыж. У перыяд уваходжання зямель у склад Расійскай імперыі ў большасці выпадкаў калоны рабіліся часткай асвячоных каталіцкіх могілак, якія ствараліся побач з манументамі, каб падкрэсліць сакральнасць месца і абараніць помнікі ад знішчэння. Таксама ў шэрагу выпадкаў у сувязі з неспрыяльнай палітычнай сітуацыяй калоны пераназываліся ў гонар святых, што ратавала помнікі ад разбурэння.

У традыцыі ўстаноўкі крыжоў (надмагільных, паклонных, прыдарожных і інш.), найцяснейшым чынам звязанай са старажытнымі дахрысціянскімі язычніцкімі вераваннямі [7], выяўляецца сінтэз культавай, мемарыяльнай і аксіялагічнай функцый. Ставілі крыжы на месцы трыумфальных і трагічных падзей.

Тэрыторыі Гродзенскай, Брэсцкай, Мінскай абласцей Беларусі, усходняя частка Літвы (Віленшчына, Паневяжскі і Каўнаскі раёны), Беласточчына Польшчы да XIV ст. "уяўлялі сабой адзіную прастору бытавання драўляных крыжоў адмысловага тыпу, у мастацтвазнаўстве яны вядомыя пад назвай літоўскіх" [8]. У відавой разнастайнасці форм увасобіўся вопыт народных майстроў, якія асаблівым чынам пераасэнсоўвалі і адлюстроўвалі язычніцкія і хрысціянскія погляды на жыццё і смерць.

Пашырэнне межаў Расійскай імперыі спрыяла культурнай экспансіі ў Паўночна-Заходнім краі, што прывяло да забароны ўстаноўкі і знішчэння ў 1839 г. (ліквідацыя Брэсцкай царкоўнай уніі) прыдарожных і могільнікавых крыжоў, упрыгожаных разьбой і тканінай, на падставе падазрэння ў іх польска-каталіцкім паходжанні [8].

Цыркулярам віленскага генерал-губернатара М. Мураўёва ад 8 ліпеня 1864 г. забаранялася ставіць

на ўскраіне Клецка на беразе ракі Лань у 1996 г. у гонар перамогі над крымскімі татарамі (1506) устаноўлены праваслаўны і каталіцкі мемарыяльныя крыжы, паміж якімі размешчаны памятны валун з мемарыяльнай дошкай. Мемарыяльны комплекс уключае таксама ўсталяваны ў 2015 г. камень з барэльефам князя Міхала Глінскага, які ўзначаліў войска ў Клецкай бітве, і сілуэтам сярэдневяковага горада.

Часта асновай помніка становяцца валуны. Адзін з самых старажытных феноменаў беларускай культуры – Барысавы камяні і Рагвалодаў камень, на якіх былі высечаныя крыжы, – помнікі эпіграфікі XII ст., сведчанне хрысціянізацыі ўсходнеславянскіх зямель і асветніцкай ролі князёў як прыхільнікаў праваслаўя.

Продкі беларусаў у дахрысціянскай традыцыі пакланяліся валунам. Ушанаваным камяням і дрэвам (напрыклад, дубам), размешчаным на месцы капішчаў – своеасаблівых сакральных комплексаў, – ахвяравалі ручнікі і іншыя тканыя вырабы. Тэрыторыі аднаго з такіх культавых свяцілішчаў на беразе Свіслачы ў Мінску (X – пачатак XX ст.) прысвоены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці (2007), там ёсць памятны знак "Малельня ля каменя" (2019). Камень Дзед (Старац) з капішча перанесены ў 1980-я гг. у Музей валуноў.

Сёння асабліва вялікія валуны прызнаюцца помнікамі прыроды. Музеі валуноў створаны ў Мінску і Воранаўскім раёне.

У выглядзе валуноў з мемарыяльнымі надпісамі выкананы помнікі пацярпелым ад палітычных рэпрэсій (Маладзечна, 1990; Бабруйск, 1998; Орша, 1990-я гг.). У Іўі з валуноў складзены рукатворны круг "Кола гісторыі" (2013): 14 камянёў сімвалізуюць значныя даты – ад пер-



Скульптурная кампазіцыя "Дзед-глыбачанін" у Глыбокім.



Помнік Францішку Багушэвічу ў Смаргоні.

шага згадвання (1444) да надання статусу горада (2000).

Валуны выкарыстаны ў якасці п'едэсталаў помнікаў Адаму Міцкевічу ў Навагрудку (1992), Францішку Багушэвічу ў Смаргоні (2009).

Традыцыяй становіцца ўзвядзенне скульптур святых пры ўездзе ў гарады: Маладзечна (кампазіцыя "Пакровы", 2011), Лагойск (абраз Божай Маці "Знаменне", 2016); на цэнтральных вуліцах: Гродна (скульптура святога Губерта, 2020), Іўе (статуя Ісуса Хрыста, 2002). На помніках у Маладзечне і Гродне адлюстраваны сюжэты гербоў гэтых гарадоў.

Такая дамінантная каштоўнасць беларусаў, як талерантнасць, увасоблена ў помніку "У гонар дружбы і згоды канфесій Іўеўшчыны" (2012). Скульптурная кампазіцыя Ісуса і Самаранкі (2014) у Глыбокім сімвалізуе духоўнасць і мір паміж вернікамі розных канфесій.

Сярод кампазіцый, якія транслююць сацыяльныя каштоўнасці, – скульптуры, прысвечаныя хлебу (Пінск, 2014) і сям'і (Глыбокае, 2016). Патрыятызм як каштоўнасць сімвалізуюць помнікі пінчуку (Пінск, 2016) і глыбачаніну (Глыбокае, 2015). Прататыпам скульптурнай кампазіцыі "Дзед-глыбачанін" стаў мясцовы педагог і краязнаўца А. Сабалеўскі, які пачаў пісаць кнігу пра Глыбоччыну ў 87 гадоў.

Гістарычныя рэсурсы актыўна выкарыстоўваюцца ў фарміраванні сучаснага аблічча горада, з'яўляючыся крыніцай яго сацыяльна-культурнага развіцця, каштоўнаснага напаўнення.

Дабрабыт, дастатак, а таксама сувязь гістарычных эпох сімвалізуе скульптура "Манета" каля галаўнога офіса банка "Дабрабыт" у Мін-

ску (2020), на якой змешчаны фрагменты грашовых знакаў, якія хадзілі на тэрыторыі Беларусі [13].

Мемарыяльныя знакі нагадваюць пра страчаныя храмы, замкі і інш. Так, памятны знак у выглядзе паўразбураных арак з граніту з выявай каталіцкага і праваслаўнага крыжоў усталяваны на месцы касцёла Найсвяцейшай Панны Марыі (Фара Вітаўта, другая палова XIV ст.) у Гродне (2014). Памятныя знакі створаны на месцы дзядзінца ў Пінску (1997), Нямецкай слабады і лютэранскай царквы ў Мінску (2019).

Помнікі фіксуюць найважнейшыя ў сацыякультурнай дынаміцы горада падзеі. Памятны знак у цэнтры Клецка (2017) прысвечаны першаму згадванню ў пісьмовых крыніцах, атрыманню герба і дзейнасці кнігадрукара Сымона Буднага.

Актуалізацыя гістарычных імёнаў у гарадской прасторы валодае магутным патрыятычным пасылам. Мемарыялізаваны сімвалічны герой можа паслужыць маркерам гарадской ідэнтычнасці і памяці, інструментам якаснага абнаўлення прасторы.

У Лідзе ў 2017 г. на будынку мастацкай галерэі на бульвары Гедыміна быў створаны мурал з выявай князя. У 2019 г. помнік Гедыміну ўсталявалі каля сцен Лідскага замка, заснаванага князем у 1323 г. Драўляная скульптура Вітаўта ў Гродне (1993), выкананая з суцэльнага дубу, была перададзена гораду Літоўскім фондам культуры.

Асаблівае месца ў культуры займаюць нацыянальныя ваенныя мемарыялы, часткай якіх з'яўляецца Магіла Невядомага Салдата (у Рыме, 1921; Велінгтане, 1932, 1964; Атаве, 1939; Амстэрдаме, 1956 і інш.)

Патрыятычнае напаўненне манументаў, прысвечаных Першай сусветнай, Другой сусветнай, Вялікай Айчыннай і іншым войнам, героям, якія ўвасабляюць самаахвяраванне, адвагу, вернасць Радзіме, выводзіць іх у нацыянальныя, робячы актуальным інструментам нацыястварэння, сучаснага нацыянальнага дыскурсу.

Такім чынам, у манументах акумулюецца гістарычны вопыт каштоўнаснага пазнання. Помнікі служаць ушанаванню асоб або падзей, якія ўвасабляюць у кожны пэўны часавы перыяд найважнейшыя вітальныя, сацыяльныя, палітычныя, маральныя, рэлігійныя, эстэтычныя каштоўнасці.

Помнік як інструмент сацыяльнай камунікацыі паведамляе пра каштоўнасці і сам валодае камунікацыйнай каштоўнасцю. Каштоўнасці фарміруюцца, як адзначаў А. Мегіл, праз стаўленне да рэпрэзентацыі мінулых падзей, якое падзяляюць члены супольнасці, для пацвярджэння пачуцця адзінства, замацавання ўнутраных сувязей [14, с. 116].

Згодна з канцэпцыяй Г. Рыкерта, культура, з аднаго боку, – гэта працэс рэалізацыі ўсеагульных сацыяльных каштоўнасцей на працягу гістарычнага развіцця, а з другога – "сукупнасць аб'ектаў, якія звязаны з агульназначнымі каштоўнасцямі і шанують дзеля гэтых каштоўнасцей" [15, с. 59]. Каштоўнасць, з'яўляючыся ўніверсальнай сістэмаўтваральнай катэгорыяй, становіцца фільтрам для высвятлення значнасці тых ці іншых падзей у мінулым.

### Спіс літаратуры


1. **Riegl, A.** Der Moderne Denkmalkultus: Sein Wesen und seine Entstehung / A. Riegl. – Wien und Leipzig : W. Braumüller, 1903. – 145 S.
2. **Dvořák, M.** Katechismus der Denkmalpflege / M. Dvořák. – Wien : J. Bard, 1916. – 140 S.
3. **Стурейко, С.** Проблема выяснения истоков культа наследия / С. Стурейко // Антропология культурного наследия: взгляд на Беларусь. – Минск, 2010. – С. 6–21.
4. **Скороход, И. Г.** О памятниках Конституции Речи Посполитой 3 мая 1791 г. / И. Г. Скороход // Статут Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага 1588 г.: да 430-годдзя выдання : зб. навук. арт. па матэрыялах канф. – Мінск, 2018. – С. 223–225.
5. **Інеўска, Э.** Калоны Славы ў гонар Канстытуцыі 3 Траўня : каталог : на пол., беларус., рус. мовах / Э. Інеўска. – Мінск : Галіяфы, 2017. – 53 с.
6. **Короткевич, В.** Черный замок Ольшанский : роман ; Дикая охота короля Стаха : повесть / В. Короткевич ; пер. с бел. В. Щедриной. – Минск : Маст. літ., 1984. – 527 с.
7. **Сергачев, С.** Придорожные кресты – традиционная малая архитектурная форма Беларуси [Электронный ресурс] / С. Сергачев // Архитектура и строительные науки. – 2013. – № 3, № 4 (16, 17). – Режим доступа: https://ais.by/article/pridorozhnye-kresty-tradicionnaya-malaya-arhitekturnaya-forma-belarusi. – Дата доступа: 02.01.2021.
8. **Зорина, Л.** Белорусские деревянные кресты [Электронный ресурс] / Л. Зорина // Harodnia.com. – 2017. – Режим доступа: https://harodnia.com/be/uczora/681-lyubov-zorina-belaruskie-derevyannye-kresty. – Дата доступа: 11.11.2020.
9. **Ганчар, А. И.** Римско-католический костел в Беларуси (1864–1905 гг.) : моногр. / А. И. Ганчар. – Гродно : ГГАУ, 2008. – 276 с.
10. **Кароль, М. М.** Палітыка расійскіх улад па трансфармацыі сацыякультурнага ландшафту ў беларускіх губернях пасля паўстання 1863–1864 гг. / М. М. Кароль // XIX Респ. науч.-практ. конф. молодых ученых, Брест, 12 мая 2017 г. : сб. матер. – Брест, 2017. – С. 182–184.
11. **Сергачев, С. А.** Историко-культурный потенциал объектов народной архитектуры Белорусского Подвинья / С. А. Сергачев // Актуальные проблемы архитектуры Белорусского Подвинья и сопредельных регионов : сб. статей респ. науч.-практ. семинара, Новополоцк, 8–9 окт. 2015 г. – Новополоцк : ПГУ, 2015. – С. 3–11.
12. **Памятники жертвам политических репрессий на территории бывшего СССР** [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.sakharov-center.ru/asfcd/pam/?t=list. – Дата доступа: 20.01.2021.
13. **Галкін, А.** Манета манет / А. Галкін // Наша гісторыя. – 2021. – № 12 (29). – С. 88–90.
14. **Мегилл, А.** Историческая эпистемология / А. Мегилл. – М. : Канон+: РООИ "Реабилитация", 2007. – 480 с.
15. **Риккерт, Г.** Науки о природе и науки о культуре ; пер. с нем. / Г. Риккерт. – М. : Республика, 1998. – 413 с.